МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

БАРАНОВИЧСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ВЫСШИЙ
ПЕДАГОГИЧЕСКИЙ КОЛЛЕДЖ

Репозиторий БарГУ

# В МИРЕ ХУДОЖЕСТВЕННОСТИ

## Сборник научных статей

Барановичи
2001

УДК 7.01 / 097+82.09 (082)
ББК 87. 8+83.3
В 11

**Рецензенты:** кандидат филологических наук, доцент А.М. Лагуновский; кандидат философских наук, доцент Л.В. Юрчик

**Научный редактор:** кандидат философских наук, доцент В.А. Дудко

**В мире художественности:** Сб. науч. статей / Науч. ред.
В 11 В.А. Дудко.– Барановичи: БГВПК, 2001.– 152 с.

ISBN 985-6616-47-6

Сборник состоит из трех разделов: "Проблемы общей теории художественности", "Поэтика художественных жанров", "Поэт Валерий Игнатенко: "свой" в XXI веке". В книге дается научный анализ категории "первоэлементы художественности", аспекта зависимости законов художественной игры от законов практической деятельности, исследуется поэтика разных художественных жанров. Сборник адресуется специалистам системы образования, которые занимаются преподаванием учебных дисциплин эстетического цикла, учащимся, студентам и всем интересующимся природой явления художественности.

**ISBN 985-6616-47-6**

**УДК 7.01 / 097+82.09 (082)**
**ББК 87. 8+83.3**
**В 11**

ЧИТАЛЬНЫЙ ЗАЛ

© Барановичский государственный высший педагогический колледж, 2001

Репозиторий БарГУ

Рэпазіторый БарГУ

# ВЫВУЧЭННЕ ЛІРЫКІ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА ЯК СРОДАК ФАРМІРАВАННЯ ГІСТАРЫЧНАЙ СВЯДОМАСЦІ ШКОЛЬНІКАЎ

А.І. Барадзіна

Беларусь, г. Баранавічы

Да асваення мінулага людзей прыцягваюць запыты практычнай дзейнасці, неабходнасць грамадскай самаідэнтыфікацыі, каштоўнасна-культурны аспект. Усе гэтыя кампаненты гістарычнай свядомасці ўзаемазвязаны і ў той ці іншай ступені прасякнуты эстэтычным зместам, таму яе феномен уключае як пазнавальныя, навукова-тэарэтычныя формы асваення гістарычнай рэальнасці, так і мастацка-фальклорныя формы, літаратурныя, жывапісныя, музычныя творы на гістарычныя тэмы.

Аб'ектываваны ў вобразнай форме патэнцыял у спалучэнні з вынікамі гістарычнага пазнання выступае перадумовай фарміравання асобаснай гістарычнай свядомасці. Удзел мастацтва ў гэтым працэсе ёсць не што іншае, як пранікненне мастацка-вобразнага мыслення ў мысленне гістарычнае. У выніку адбываецца яго прамое ўздзеянне на гістарычнае веданне. Элементы мастацкага мыслення надаюць гістарычным ведам эмацыянальную афарбоўку, нагляднасць, выраз-

насць, адбітак светаўспрымання мастака праз мову і стыль. Праз "літаратурамастацкамоўную творчасць гісторыя паўстае як свет суб'екта, дзе... самасатварэнне свае, індывідуальнае гісторыі ўрачыстуе над аб'ектыўнай ходою падзей" [1, 6]. Сутнасць жыццёвага ўздзеяння літаратуры ў вопыце мудрага быту, паэзіі чалавечых адносін, выпрацаванай народам жыццёвай філасофіі. Усеабдымнасць яе мастацкага свету і выхаваўча-развіццёвага ўплыву на свядомасць абумоўлена самой спецыфікай мастацкага слова, яго прызначэннем адлюстроўваць жыццё цэласна, сінтэтычна, адкрываць ва ўсім яго чалавечы змест.

Мастацкая інфармацыя складваецца з таго, аб чым гаворыць твор мастацтва, і з таго, як увасоблены ў творы гэты змест. Эстэтычныя катэгорыі адлюстроўваюць гістарычную рэальнасць. Характар адносін паміж гэтымі ўзроўнямі вызначае індывідуальную змястоўнасць інфармацыі мастацкага твора, які існуе толькі ў межах дадзенай цэласнасці. Пазнавальная функцыя мастацтва падпарадкавана эстэтычнай і можа быць рэалізавана толькі праз яе, "рэальнасць прысутнічае ў мастацкай свядомасці як свет-метафара" [1, 6]. Зварот да мастацтва як крыніцы гістарычнага пазнання зусім заканамерны, бо кожны яго від сваімі спецыфічнымі мастацкімі сродкамі і прыёмамі адлюстроўвае рэчаіснасць і адносіны аўтара да яе. Дзякуючы таму, што адлюстраванне аб'екта арганічна звязана з выяўленнем суб'екта, самавыяўленнем, самарэалізацыяй, мастацкі вобраз ідзе значна далей за тое, што дае аб'ектыўна-ісціннае навуковае пазнанне духоўнага жыцця.

Аб'ектыўная ісціна і мастацкая праўда не з'яўляюцца антаганістамі. "Канчатковы вынік, да якога імкнецца мастацтва, мае два бакі: ісціну і прыгажосць. Для дасканалага мастацтва існуе толькі адзін канчатковы вынік – ісцінная прыгажосць... Калі адсутнічае ісціна, то мы бачым прыгажосць нізкага ўзроўню, пазбаўленую цэласнасці. Калі ж адсутнічае прыгажосць, ісціна выраджаецца ў трывіяльнасць. Каштоўнасць ісціны абумоўлена прыгажосцю" [4, 672]. Мастацкая інфармацыя – гэта і звесткі хранікальнага, фактычнага характару, што пацвярджаюць ці дапаўняюць ужо вядомае, і больш суб'ектыўны, складаны і важны зрэз, у якім зафіксаваны адносіны суб'екта да падзей, іх ацэнка мастаком, бо гістарычнае веданне ўжо нават на эмпірычным узроўні абцяжарана інтэрпрэтацыяй. Спецыфіка інфармацыйна-пазнавальнага патэнцыялу мастацтва заключаецца ў яго эстэтычнай афарбоўцы, а мастацкая праўда выступае як крытэрыем ісціннасці твора мастацтва, так і эстэтычным крытэрыем яго мастацкай дасканаласці.

Рэпазіторый БарДУ

Пісьменнік жа сілай творчай фантазіі здольны ператварыць разнародныя факты ў вобразы, што адкрываюць чытачам глыбіні чалавечых характараў і адносін, увасабляюць эмацыянальна афарбаваны падыход да навакольнага свету. "Гісторыя – дзея прамоўленая, дзея, якая адбылася праз слова і засталася ў ім як эпас, як апавяданне пра рэчаісны свет", але разам з тым "гісторыя – гэта не толькі "што прамоўлена?", але і "як прамоўлена?"; гісторыя – індывідуальнае экспрэсіўна-эстэтычнае асваенне (асябечванне) агульнамоўнага намінатыўнага матэрыялу, падпарадкаванне гэтага матэрыялу сваёй духовай сіле і пакіданне ў гэтым матэрыяле свае творчыя асабістасці. Такім чынам, гісторыя творыцца не гэтак імператарамі, ваяводамі, людскімі гушчамі, якія, знаходзячыся ў агульнай сістэме культуры, усяго толькі вытвараюць падзеі і ўчынкі, а апавядальнікам-мысляром, ягонаю прагаю асябечыць намінатыўны матэрыял пэўнага народа. Літаратурнае маўленства – найбольш дасканалая форма гэткага асябечвання" [1, 5 – 6].

Таму прыярытэт у фарміраванні гісторыка-патрыятычнай свядомасці асобы як гуманістычна арыентаванай каштоўнаснай свядомасці належыць мастацкай літаратуры, якая спрые выпрацоўцы асобасных сэнсаў на ўзроўні дыялектыкі паняцця і ўяўлення. Найбольшая цікавасць літаратуры прыцягнута да перажывання асобай гістарычнага працэсу, а рэчаіснасць разглядаецца праз прызму яе каштоўнасці для чалавека. У літаратурных творах гісторыя Айчыны паўстае ў мастацкіх вобразах як эстэтычны аб'ект. Зварот да вобразнага мыслення і ёсць умова больш адэкватнай перадачы гістарычнай рэальнасці, максімальнага набліжэння да духоўнага свету асобы, што павышае эфектыўнасць выхаваўчага ўздзеяння ў працэсе вывучэння літаратуры, якое ў поўнай меры рэалізуецца толькі пры ўмове эстэтычнага асваення мастацкіх твораў на гістарычную тэму.

Так, як у новых гістарычных умовах Ул. Караткевіч прадоўжыў традыцыі сваіх папярэднікаў, гэтак і яго творчасць прыкметна ўплывае на сучасны беларускі літаратурны працэс. Дбаючы аб грамадзянска-патрыятычным выхаванні моладзі, пісьменнік імкнуўся ўдасканальваць як змест, так і форму сваіх твораў. Ёсць усе падставы сцвярджаць, што яны напісаны як бы навырост, маючы на ўвазе іх здольнасць задаволіць любы мастацкі густ, адпавядаць духоўным запатрабаванням асобы на кожным этапе яе развіцця. З улікам гэтага ажыццёўлены пэўны падбор твораў Ул. Караткевіча ў сучасных школьных праграмах і эксперыментальнае навучанне, праведзенае аўтарам па распрацаванай ім методыцы, вопыт якога прадстаўлены ў дадзеным артыкуле.

Рэпазіторый БарДУ

Спецыфіка ўспрымання літаратуры школьнікамі ў 5 класе робіць яго пераходным звяном ад пачатковай да сярэдняй ступені літаратурнай адукацыі. Яе зместам на гэтым этапе з'яўляецца азнаямленне вучняў з разнастайнасцю прыёмаў і сродкаў адлюстравання жыцця ў фальклорных і літаратурных творах. Вершы, што прапануюцца ў першым раздзеле праграмы, сваім зместам і формай закліканы сцвердзіць думку пра родную мову як захавальніцу нацыянальнай, патрыятычнай і гістарычнай свядомасці народа, выклікаць захапленне яе прыгажосцю і мілагучнасцю, у якіх адбіліся хараство роднай прыроды і духоўнае багацце людзей, што спрадвеку жывуць на беларускай зямлі.

Так, верш Ул. Караткевіча "Бацькаўшчына" прызначаны для самастойнага чытання, аднак мэтазгодна прысвяціць яму час на ўступных занятках да курса літаратуры 5 класа, каб акцэнтаваць увагу на такіх аспектах, як важнейшыя прыёмы і сродкі мастацкага адлюстравання ў літаратуры і яе пазнавальнае і выхаваўчае значэнне. Будаваць работу над курсам з самога пачатку трэба з улікам таго, што эфектыўнасць засваення літаратуры як школьнага прадмета "залежыць не толькі ці не столькі ад колькасці засвоенай вучнямі інфармацыі, колькі ад іх уяўлення, інтуіцыі, свежасці погляду і пранікліваспі... Іншымі словамі, маецца на ўвазе самастойнасць і дывергентнасць мыслення" [3, 67]. Эфектыўным на дадзеным этапе з'яўляецца метадычны прыём мантажу тэксту з россыпу слоў, для якога варта скарыстаць наступныя ўрыўкі з верша:

Дагарэў за брамай небакрай,
Месяц паміж воблачкаў плыве.
Выйду зноў, як у мінулы май,
Басанож прайдуся па траве…
Ціха цмокае ў сне рака.
О, як добра, як прыгожа жыць!
Раска, як русалчына луска,
На вадзе ад месяца гарыць.
А вакол травіцы роснай рай
І бярозак белая сям'я.
Мой чароўны беларускі край,
Бацькаўшчына светлая мая!

Урыўкі друкуюцца вялікімі літарамі без знакаў прыпынку, затым разразаюцца на асобныя часткі і вучням прапануецца ўзнавіць зыходны тэкст. Такое заданне ставіць вучняў у пазіцыю аўтара і



Рэпазіторый БарДУ

творцы, развівае навыкі аналізу і сінтэзу, а па выніках яго настаўнік здольны меркаваць пра наяўнасць літаратурных і творчых здольнасцей навучэнцаў і кіравацца гэтым у далейшай дзейнасці. Акрамя таго, рэалізуецца міжвольнае запамінанне пры "навучанні з захапленнем".

Пэўныя цяжкасці ў пяцікласнікаў узнікаюць з прычыны недастатковага валодання лексікай беларускай мовы і спецыфікай мастацкай вобразнасці, да высвятлення якой пераходзім пасля работы з урыўкамі.

Часткова скарыстоўваецца метадычны апарат падручніка.

– Якія карціны прыроды, створаныя паэтам, паўстаюць перад вамі пры чытанні верша? Якая пара года, час сутак, месца дзеяння?

– Вясна. Ноч. Луг (поплаў).

Пасля гэтага адзначаныя адказы ілюструюцца адпаведнымі вобразнымі выразамі, такімі як "прачышчае горла салавей", "лашчыцца трава да босых ног", "дымная, сцюдзёная раса", "ціха цмокае ў сне рака" і інш.

– Якія пачуцці абудзіла ў паэта сустрэча з мілымі сэрцу мясцінамі?

Вычарпальны адказ на гэтае пытанне атрымаць цяжка з прычыны абмежаванасці лексічнага запасу пяцікласнікаў. Пры "наіўным рэалізме" эмоцыі чытача звычайна ярчэй за славесныя ацэнкі пачуццяў, што тлумачыцца малым вопытам рэфлексіі і неразвітасцю мовы.

У педагагічнай практыцы аўтара засведчыў сваю эфектыўнасць наступны прыём: складанне тэматычнага слоўніка "Пачуцці", які змяшчаецца ў вучнёўскіх сшытках па літаратуры і пастулова папаўняецца. Мэтазгодна пачынаць гэтую работу з самага пачатку літаратурнага курса і ўжо на дадзеным уроку прапанаваць вучням пэўную класіфікацыю эмацыянальнага стану асобы, пажадана ў параўнальным аспекце, што не толькі ўзбагачае іх веданне пра складанасць пачуццёвага свету чалавека, а і дапамагае ўсведамляць уласную гаму эмацыянальных перажыванняў, а затым і маральных каштоўнасцей. Эмацыянальнае жыццё асобы – гэта пачатак яе духоўнага свету, яе культуры.

**Узор табліцы**

| | | |
|---|---|---|
| Любоў | Нянавісць | |
| Пяшчота | Непрыязнасць | |
| Радасць | Смутак | |
| Хваляванне | Абыякавасць | і г.д. |



Репозиторий БарГУ

З дапамогай табліцы-апоры вучні вызначаюць дыяпазон пачуццяў, якімі прасякнуты твор, а таксама змену настрою на працягу яго.

Сінтэзуе вынікі папярэдняй работы пытанне:

– Якія словы, выразы ўбіраюць у сябе такую разнастайную гаму пачуццяў? Абгрунтуйце вашу думку.

Згадваецца словазлучэнне "чароўны беларускі край". Аргументы: бо тут адбываюцца незвычайныя рэчы – гарыць небакрай, дыміцца раса, трава лашчыцца, рака спіць і цмокае, як дзіця; паэт апісвае незвычайную прыгажосць роднай зямлі. Нездарма ж тут "добра і прыгожа жыць". Абгрунтоўваючы выраз "Бацькаўшчына светлая мая", вучні адзначаюць, што такое ўражанне ствараецца ад святла месяца, бляску раскі на вадзе, мігцення светлякоў, ад беластволых бярозак ля ракі; ад таго, што родныя мясціны мілей за ўсё.

Зносіны на дадзеным уроку будуюцца ў першую чаргу праз абуджэнне патрыятычных пачуццяў вучняў. Паколькі аналіз твора – гэта вырашэнне праблем, пастаўленых пісьменнікам, то адзін з галоўных кампанентаў любога ўрока – даследаванне аўтарскай пазіцыі. На пачатку яна можа быць сфармулявана як адказ на пытанне "Якім вам уяўляецца чалавек, што напісаў такі верш?" Пераважае адказ: "Добрым". Але пры канкрэтызацыі выяўляецца шматзначнасць слова ў вучнёўскім разуменні: здольны бачыць прыгажосць свайго краю, уважлівы да ўсяго ў ім, неабыякавы, таленавіты, вельмі добра ведае родную мову, крышку сумны. Маральна-светапоглядная ўстаноўка пісьменніка... павінна быць у ідэале аднолькавай як для чытача, так і для самога сябе. Гэта цалкам адпавядае жыццёваму і пісьменніцкаму крэда Ул. Караткевіча, што робіць выхаваўчы эфект яго твораў максімальным.

Асноўны прынцып пабудовы падручніка-хрэстаматыі для 6 класа – прынцып параўнання, раскрыцця ў вывучаемых з'явах (прозе і паэзіі, літаратуры і публіцыстыцы, літаратуры і гісторыі) агульнага і адрознага. У працэсе навучання выкарыстоўваюцца многія віды параўнання: поўнае, калі адначасова раскрываюцца агульныя і адрозныя прыкметы, і няпоўнае; комплекснае і аднолінейнае; супастаўленне падобных ці супрацьпастаўленне процілеглых з'яў. Усвядомленае апераванне дадзеным лагічным прыёмам дазваляе вучням лепш бачыць у вывучаемых аб'ектах як выяўленне агульных заканамернасцей, так і непаўторныя асаблівасці кожнага з іх; спрыяе больш трываламу запамінанню вучэбнага матэрыялу; дапамагае весці пошук неабходных для параўнання прадметаў і прымяняць аналогію. Мастацкія і навуковыя (гістарычныя) творы разглядаюцца ў 6 класе

Рэпазіторый БарДУ

шляхам поўнага параўнання, раскрыцця агульных і адрозных прыкмет. Для чытання і вывучэння прапанаваны ўрывак з кнігі М. Ермаловіча "Старажытная Беларусь" ("Вячка і Усевалад у барацьбе з крыжакамі") і мастацкія творы. Празаічны – раздзел з аповесці Л. Дайнекі "Меч князя Вячкі" – і паэтычны – "Балада пра Вячку, князя людзей простых".

Усе аўтары, безумоўна, абапіраліся на дакументальны матэрыял, летапісныя творы, адзін з якіх згадвае М. Ермаловіч, – "Хроніка Лівоніі". Для гістарычнага даследавання, як ужо вядома вучням, уласцівы сціслая перадача сутнасці падзей, спакойна-аб'ектыўная перадача зместу. Пасля знаёмства з творам Л. Дайнекі школьнікі ўяўляюць, што паказ тых жа падзей у мастацкім творы маляўнічы, зрокава-наглядны, поўны бытавых падрабязнасцей і дэталей, якія часта з'яўляюцца плёнам пісьменніцкай фантазіі, аднак у выяўленні галоўнай сутнасці падзей, што адбываліся ў далёкім мінулым, мастацкі паказ у дадзеным творы не разыходзіцца з навуковым. Актуалізаваўшы гэтыя звесткі, звяртаемся да балады Ул. Караткевіча. Гістарычная аснова твора ўзнаўляецца праз лексічны каментарый, паколькі паняцце пра архаізмы, гістарызмы і іх мастацкую функцыю вучні ўжо маюць. Пасля выразнага чытання балады пераказваецца яе сюжэт і выяўляецца агульнае (сутнасць рэальных гістарычных падзей) з папярэднімі творамі. Аднак паказ гэтых падзей адметны. Варта ўлічыць і час напісання балады, 1957 г. Гэты твор папярэднічае ўсім астатнім, і ёсць усе падставы гаварыць пра караткевічаўскія традыцыі ў аповесці Л. Дайнекі. Пачатак адкрытай вайны Полацка з крыжакамі паказаны паэтам сцісла і ярка ў першым чатырохрадкоўі, а ў наступным гаворыцца пра складанасць барацьбы. Адзначаюцца формы слова "князь" і "князькі". Ацэначная роля суфікса відавочная, а ўзмацняе ацэнку эпітэт "брудныя" душы. Абставіны, пры якіх трапіў у палон "сумленны хлопскі князь" Вячка, абодва пісьменнікі выводзяць з крыжацкіх нораваў, бо "хітрасці трэба вучыцца ў тэўтонаў". Тое, што ў Караткевіча князь трапляе ў палон "параненым і слабым", характарызуе абодва бакі. Настаўнік паведамляе вучням, што ў "Хроніцы Лівоніі" нічога не гаворыцца пра пагібель князя, які "пайшоў у Прусію, каб ніколі больш не вяртацца ў сваё каралеўства". У наяўнасці аўтарская фантазія. Аднак неабходна паказаць вучням, што яна абумоўлена логікай гісторыі. Хаця барацьба з Ордэнам яшчэ на працягу стагоддзяў вызначала гісторыю Полацка, але ён спалучыў свае сілы з сіламі Пскова, Ноўгарада, Прыбалтыкі, Польшчы, што і дало ў далейшым магчымасць зламаць і спыніць крыжацкую агрэсію.



Рэпазіторый БарДУ

А такое магло адбыцца дзякуючы самаахвярнай барацьбе, апісанне якой зачытваецца з балады і параўноўваецца з празаічным. Вучні адзначаюць большую сцісласць і напружанасць, яркую вобразнасць, як метафара "парчу і аксаміты тапталі ў бруд яны". Месца дзеяння дапамагаюць уявіць эпітэты "грозны", "пранізлівы", "злавесны". План, які нарадзіўся ў галаве Вячкі, дачасна не раскрываецца ні ў аповесці, ні ў баладзе, але чытачы міжвольна чакаюць паварота дзеяння пасля слоў "Але сканаць пакорным і мяккім, быццам пух?.." Адказ на гэта пытанне вучні знаходзяць у тэксце:

О, лепей дні закончыць на полі баявым,
Ніж век глытаць у кайданах чужынскіх вогнішч дым!

Настаўнік засяроджвае ўвагу класа на патрыятычным пафасе твора праз супастаўленне вобразаў беларускай і рускай паэзіі (Дым "чужынскіх вогнішч" – і "дым Отечества"), а таксама выяўляе глыбіню патрыятычнай традыцыі ў айчыннай літаратуры праз Скарынава "Понеже от прирождения..." (прадмова да кнігі "Юдзіф"). Падкрэсліваецца, што ўсё жывое, свядома ці падсвядома, мае адчуванне радзімы.

– Як праводзіць гэтую думку Ул. Караткевіч?

– Праз вобраз баявога каня, вернага князевага сябра.

Зачытваецца зварот Вячкі да каня. Акрамя таго, праз гэты вобраз пэўней характарызуецца сам князь Вячка: чулы да ўсяго жывога, свабодалюбівы, з пачуццём уласнай годнасці.

Вучням прапануецца ўспомніць, што ўвасабляе Л. Дайнека ў аповесці "Меч князя Вячкі" у такіх мастацкіх вобразах: "Змрок стукаўся ў грудзі. Кіпеў над галавой нябесны блакіт. Уздрыгвала зямля. Спалоханыя зайцы і казулі ратаваліся, хто як мог" – а таксама адшукаць вобразы, аналагічныя па зместу, у баладзе. З апошніх цяжкасць уявіў вобраз "Ты грэбаваў зямлёю, што слалася ў нагах", і змест яго быў высветлены пры дапамозе настаўніка. Як ужо вядома з нарыса "Зямля пад белымі крыламі", вобраз каня ў беларускай літаратуры мае рэалістычна-рамантычны сэнс: гэта сябар, і памочнік, і – увасабленне мары пра справядлівасць і свабоду. Непарыўныя ў баладзе паняцці радзіма і свабода. Усяму жывому мілы родны куток і агідны ланцуг (як Бурыку, успамінаюць вучні). Вячка разумее, што зварот на радзіму для яго магчымы толькі ў марах, але імкнецца дастаць хоць імгненне волі, пры гэтым выразна ўсведамляючы, што сілы няроўныя, што часу ў яго вельмі мала. Князь і яго верны конь як бы зліваюцца ў адну неверагоднай сілы і спрыту істоту – і закіпеў бой. Зачытваюцца дзеясловыя словазлучэнні, якія перадаюць дынаміку і напружанасць дзеяння. Але блізка трагічная развязка, і апошнія словы князя звернуты таксама да



Рэпазіторый БарДУ

баявога сябра, і тут як бы зліта ў адно іх светаадчуванне: "Мы болей не пабачым лугі і родны край". За адно імгненне волі – нечалавечае напружанне сіл; за Радзіму – жыццё. На такое здольны толькі высакародны чалавек, "алень" "з крывёю гордай". Як кантрастны вобраз вучні адзначаюць "зграі злых сабак", што накінуліся на героя, ірвучы і раздзіраючы яго магутнае, але зраненае цела ("я ў стрэлах, быццам вожык"), утоптваючы яго ў "пыл і гразь".

На працягу ўрока дамінуючай установкай з'яўляецца, што найперш твор мастацтва выконвае эстэтычную функцыю, адлюстроўваючы гістарычныя рэаліі спецыфічнымі мастацкімі сродкамі і выяўляючы адносіны аўтара да іх. У фінале заняткаў пытанні падагульняючай гутаркі яшчэ раз засяроджваюць вучняў на спецыфіцы балады, яе гістарычнай аснове, адлюстраванні гэтых жа падзей у навуковай літаратуры, на ролі аўтарскай фантазіі і выяўленчых сродкаў у раскрыцці ідэйнага зместу твора.

Верш Ул. Караткевіча "Беларуская песня" вывучаецца ў 7 класе як узор грамадзянскай лірыкі, дзе асоба лірычнага героя нясе адбітак характару і духоўнага свету самога аўтара. Пытанні і заданні, змешчаныя ў падручніку-хрэстаматыі, спрыяюць мэце фарміравання гістарычнай і патрыятычнай свядомасці падлеткаў, абуджэнню іх пазнавальнай актыўнасці.

Аднак першым крокам да ўсведамлення ідэі аўтара з'яўляецца загаловак, які актуалізуе ў наяўным вопыце чытача тыя ўяўленні, на якія будуць абапірацца новыя веды, і настройвае на наступны дыялог з тэкстам да чытання і ў працэсе чытання, у час чаго адбываецца спасціжэнне зместу і яго галоўнай думкі.

З урокаў развіцця мовы вучням вядома, што ў назве любога тэксту можа заключацца або яго тэма, або асноўная думка. Вучням прапануецца высветліць гэта адносна назвы "Беларуская песня" пасля аналізу верша. Гучанне назвы вызначаецца імі як урачыстае. Першаснае чытанне выяўляе, што і сам твор мае ўрачыстае гучанне.

"Беларуская песня" – урачыстая песня – гімн. Значэнне апошняга слова ўдакладняецца па тлумачальным слоўніку.

1. Урачыстая песня, дзяржаўная, партыйная і інш.

2. Увогуле хвалебная песня або музычны твор.

Сістэма пытанняў накіравана на высвятленне таго, што надае вершу якасці гімна. Вызначаецца вершаваны памер (пяцістопны анапест), і падрыхтаваны вучань чытае пачатак "Іліяды" Гамера з мэтай параўнання гучання гэтых твораў. Перад паўторным чытаннем "Беларускай песні" ставіцца задача засяродзіцца пры слуханні на гукапісе і тых зрокавых уяўленнях, якія твор выклікае, а затым выказаць іх ад-

ным словам (прыгажосць). Адносна гукапісу адзначалася, што ў першую чаргу адчуваюцца зацвярдзелыя, а побач з імі – мяккія. Выказана цікавая думка, што гукавая карціна разнастайная, як розная і наша Радзіма ў вершы. Урачыстае гучанне зацвярдзелых – гэта наша гісторыя, наш характар, нашы сімвалы. Напрыклад: вечная песня Белавежы, вежы Наваградка, мудрыя продкі, гордая мова і інш.

Дэманструецца нагляднасць: выявы замка Міндоўга, Сафійскага сабора над Дзвіною, пейзажныя карціны. Прапануецца шэраг азначэнняў да слова "прыгажосць": паэтычная, сціплая, тонкая, гордая, далікатная, пяшчотная, справядлівая, суровая, свабодная. Вучням прапануецца размясціць гэтыя паняцці па прынцыпу градацыі, а потым вызначыць, на іх думку, вядучае.

Меркаванні ў асноўным супалі: гордая. Аргументацыя: па-першае, ёсць чым ганарыцца. Гісторыя, прырода, людзі Беларусі ў непарыўнай сувязі паўстаюць перад чытачом. Па-другое, "гордыя" сродкі. Найперш лексічныя, якія абазначаюць тое, чым мы павінны ганарыцца: мова, зямля (ралля, баразна), зоры, ветразь, сцяг і інш. Адметныя эпітэты і параўнанні: бары-акіяны, Сафія... нібы карабель; на гордых, як мора, азёрах і інш. І, нарэшце, сродкі гукапісу. З падручніка зачытваецца тэзіс, з нагоды якога вучні павінны выказаць сваё меркаванне па творы: "Алітэрацыя і асананс могуць стварацъ мастацкі вобраз нават самі па сабе, амаль незалежна ад сэнсу слоў. Таму сапраўдныя майстры карыстаюцца гэтымі магутнымі сродкамі асцярожна і тактоўна, каб гэты мастацкі прыём не вылучаўся з агульнага ўспрыняцця верша".

Вучні адзначаюць, што дадзены тэзіс нібыта напісаны пра верш Ул. Караткевіча "Беларуская песня". Паэт дасканала, па-майстэрску ўжывае гукапіс, мастацкі змест і мастацкія сродкі знаходзяцца ва ўзаемапранікненні і гармоніі.

Прыводзяцца ўзоры алітэрацыі і асанансу; вызначаецца роля гэтых мастацкіх сродкаў.

Там звіняць неўміручыя песні на поўныя грудзі.
Там спрадвеку гучыць мая мова, булатны клінок...
І вішнёвыя хаты глядзяцца ў шырокі Дняпро
і інш.

Абуджаная літаратурным аналізам здольнасць тлумачэння вучнямі функцыі мастацкага вобраза ў творы, як правіла, стымулюе сатворчасць чытача, дапамагае нараджэнню ўласных чытацкіх вобразаў пры зносінах з тэкстам. Гэта пацвярджаецца на наступным этапе ўрока, калі ўвага вучняў скіроўваецца на асобу лірычнага героя. Вучні ўпэўнены, што мы маем права атаясамліваць яе з асобай паэта,



Репозиторий БарГУ

бо патрыятызм, веданне Беларусі, яе гісторыі, прыроды, нацыянальнага характару – неад'емныя рысы асобы Ул. Караткевіча, што вядома з раней вывучаных імі твораў, асабліва з нарыса "Зямля над белымі крыламі".

Настаўнік прапануе шлях асэнсавання героем паняцця "радзіма".

– З чаго яна пачынаецца? З роднага кутка, з роднай хаты ("Ты – чырвоная груша над дзедаўскім домам..."), а затым усведамляецца праз прыволле родных прастораў ("і бары-акіяны, і неба – разлівы ільноў..."), праз адчуванне вялікага гістарычнага шляху продкаў ("там, дзе мудрыя продкі ў хвоях паснулі...") і асабістай далучанасці да народа, да людзей, якія "ніколі не будуць рабамі".

І ўрэшце, Радзіма – гэта наша дзяржава, "наш сцяг, што нікому... не дадзім абсмяяць, апаганіць, забыць ці мячом зваяваць". Апошнія радкі гучаць як клятва дзякуючы адметнасці паэтычнага сінтаксісу і выяўляюць непахісную грамадзянскую пазіцыю аўтара.

– А як яго характарызуюць наступныя радкі:

Дзе мой край?..
Дзе жанчыны, як радасны сон у стагах на зары,
А дзяўчаты, як дождж залаты,
А сівыя матулі, як жніўё з павуціннем і добрае сонца ўгары.

Адзначаюцца і высакародныя адносіны паэта да Жанчыны, якімі прадыктаваны арыгінальныя мастацкія сродкі: радасць ад жаночай прыгажосці; захапленне святлом і свежасцю юнацтва; пакланенне Маці.

Аднак сямікласнікі не адразу спасцігаюць мастацкую логіку, якая прывяла да стварэння такога вобраза, як "жніўё з павуціннем...". Толькі пры дапамозе настаўніка вучні прыходзяць да высновы, што ў гэтым выразе – формула жаночага лёсу: адкрасавала і дала плён, як хлебная ніва. Гэты вобраз характэрны для творчасці Караткевіча.

Настаўнік прыгадвае эпізод з апавядання "Блакіт і золата дня", дзе "перажыванні сваёй гераіні пісьменнік параўноўвае з адчуваннямі зямлі, адагрэтай сонцам, цёплым паветрам пасля доўгай зімы. Яна чакае сейбіта, каб прыняць і выпусціць наверх кінутыя ў яе зярняты. Такі стан (чаканне кахання – А.Б.) цяжка растлумачыць, яго надыход нельга прадказаць. "І ніхто, нават маці, не зразумела, што здарылася за гэтае дні дзіва: узышла на бацькоўскую байду калючы і рэзкі падлетак, а цяпер плыве дарослая дзяўчына, што ўсё зразумела нейкімі



Репозиторий БарГУ

глыбінямі душы. Быццам зямля... Нават маці не зразумела б гэтага. Як поле, якое ўсё аддало, не можа зразумець поля, якое чакае". А вобраз павуціння, на думку вучняў, выкліканы асацыяцыямі з сівізною і ўзорам маршчынак на матуліным твары.

Пачуцці як устойлівыя адносіны асобы да рэчаіснасці ёсць вынік эвалюцыі чалавецтва за час яго існавання. Спецыфіка іх выяўлення ў вучняў VII – VIII класаў у тым, што на аснове рамантычных адносін да прадстаўнікоў супрацьлеглага полу ў падлеткаў узнікае жаданне рабіцца лепшымі, з'яўляецца патрэбнасць у самаўдасканаленні. Урокі літаратуры валодаюць магчымасцю аб'яднаць два гэтыя пачаткі: суб'ектыўныя праявы юнацкага пачуцця і яго аб'ектыўна-гістарычную прыроду – а тым самым зрабіць крок да аб'яднання асобы пісьменніка і вучня.

Завяршаецца работа над вершам выразным чытаннем з захаваннем адпаведных інтанацый, што выяўляюць гордасць, пяшчоту і замілаванне. Спачатку зачытваюцца паасобку ўрыўкі, якія адрозніваюцца сваім пафасам. Заключныя радкі, у якіх увасабляецца грамадзянская пазіцыя паэта, чытаюцца на ўзор прысягі, з далучэннем да паўтораў усяго класа. Пасля гэтага вырашаецца праблема, пастаўленая ў пачатку заняткаў: тэма ці ідэя сфармулявана загалоўкам верша? Большасць вучняў схільна лічыць, што ён спалучае як тэму, так і ідэю. Прычым у першым слове ("беларуская") пераважае тэматычнае напаўненне, а ў слове "песня" – ідэйнае.

Настаўнік цытуе ўрывак з эсэ Ул. Караткевіча "Мсціслаў", які сведчыць, што беларусы – "людзі з ганаровым мінулым, славе і мужнасці, розуму і таленту якіх могуць пазайздросціць вельмі і вельмі многія, і што толькі ад іх залежыць, каб гэтая слава... не прапала ў будучых вяках, каб яны заўсёды былі поўныя высокай годнасці ў кожным слове і ў кожным учынку". Захаванне годнасці і славы продкаў залежыць ад кожнага з нас – так вызначаецца ідэя твора.

Як падвядзенне вынікаў урока – адказ на пытанне, што яднае і што розніць "Беларускую песню" Ул. Караткевіча і "Патрыятычную песню" Шандара Пецёфі.

Адзначаецца іх аднолькавы пафас, прырода грамадзянскіх пачуццяў ("мы молімся..." – "мы клянёмся..."), але разам з тым вучні пры дапамозе настаўніка ўсведамляюць, што ў "Беларускай песні" увасабляюцца нацыянальныя каштоўнасці, а ў вершы Ш. Пецёфі

радзіма выступае як інтэрнацыянальнае паняцце, бо верш не мае выразнага нацыянальнага каларыту. Аднак змест абодвух твораў агульначалавечы.

Замест верша Ул. Караткевіча "Страшіў лес свой летні чуб" мы ўключылі для самастойнага чытання верш "Дзяўчына пад дажджом". Яго праблематыка, асэнсаваная па-філасофску, выступае сёння ў якасці глабальнай праблемы чалавецтва. Твор уключаны ў абмеркаванне пры пераходзе ад вывучэння інтымнай лірыкі да пейзажнай, бо ў ім спалучаюцца рысы абодвух відаў. Вобраз дзяўчыны пад дажджом тэматычна працягвае "жаночыя" матывы верша "Беларуская песня", хаця па часе напісання папярэднічае яму.

Гераіня – адна з тых дзяўчат, што, "як дождж залаты", яшчэ, магчыма, не пакахала, але яе ўнутраны стан – стан "поля, якое чакае", чаканне кахання.

Верш уводзіцца арыгінальным чынам: ён прачытаны вучням у перакладзе на рускую мову без згадкі пра аўтара. Яны ўпэўнены, што твор напісаны пад уражаннем чарнобыльскай трагедыі, аднак, даведаўшыся пра час напісання, міжволі схіляюцца да роздуму пра феномен паэтычнага таленту, здольнага на прароцтва. Чытацкія ўражанні абумоўлены пераважна зместам апошняга радка, які рэзка кантрастуе з усім папярэднім, што аказвае моцнае эмацыянальнае ўздзеянне.

Увагу да зместу і формы верша настаўнік прыцягвае наступным творчым заданнем для жадаючых: перакласці верш на беларускую мову з мэтай параўнання на наступных занятках "двайнога" перакладу з арыгіналам і выяўлення праз гэта творчых сакрэтаў паэта і перакладчыкаў. Лепшыя варыянты засведчылі пра наяўнасць у пэўных вучняў як моўнага чуцця, так і паэтычных здольнасцей. Было адкрыта імя аўтара і абагульнены наяўныя і новыя веды па яго творчасці, у прыватнасці, адзначана філасофская аснова верша. Навошта чалавек жыве на свеце? Каб радавацца жыццю, а не набліжаць уласную смерць уласнымі рукамі...

Рэпазіторый БарДУ

Узоры перакладу:

**Дзяўчына пад дажджом**

Над лесам, над садам дзікім
Кроплі дажджу віселі.
Радасныя гваздзікі
У чыстай траве мігцелі.
Цёплыя кроплі скачуць
Па залацістай лазе.
Дожджык – "царэўна плача"
Сонца ў кожнай слязе.
Падалі кроплі звонка,
Вераб'і развялі гаману.
У сукенацчы лёгкай дзяўчынка
Выбягала насустрач дажджу.
Адносіла светлую хмарку
За поле, за сад і за лес,
Дзяўчынка губамі лавіла
Вільгаць з ясных нябес.
Празрысты быў дожджык і дзіўны,
Ды ён абляпіў, як мог,
Плечы, юнацкія грудзі,
Гібкія лініі ног…
Вясна па садах кіпела,
Гуляла ў вадзе сонца.
Дзяўчынка ад шчасця пела.
…………..
А ў тым дажджы быў стронцый.

**Дзяўчына пад дажджом**

Над лесам, над садам дзікім
Дажджынкі ляцяць, блішчаць.
Радасныя гваздзікі
У роснай траве гараць
Цёплыя кроплі скачуць
Па залацістай лазе.
Дождык – "царэўна плача",
Сонейка ў кожнай слязе.
Кроплі званілі ў акенцы,
Вераб'і ўчынілі разбор.
Дзяўчына ў лёгкай сукенцы
Выбегла з хаты ў двор.
А светлую хмарку знасіла
За край кучаравых бяроз.
Дзяўчынка губамі лавіла
Кроплі блакіту з нябёс.
А дожджык, бы ў нейкім цудзе,
Яе акрапіў, як мог.
Плечы, дзявочыя грудзі
І стройныя лініі ног.
Квецень кругом заззяла,
А сонца – аж страх глядзець!
Дзяўчына ад шчасця спявала,
Не ведала, не гадала:
Быў стронцый у той вадзе.

Лірычны твор існуе ў гучанні. Яго чытач абавязкова павінен вымавіць ад свайго імя, адважыўшыся на лірычны маналог, бо верш патрабуе далучэння да лірычнага героя, эмацыянальнага ўваходжання ў сітуацыю твора, а гэта пры чытанні і аналізе стварае асаблівыя цяжкасці. Школьнікі або не адгукаюцца на праблему верша, або падмяняюць яе ўласным жыццёвым вопытам. Паколькі небяспекі апошняга пры вывучэнні верша "Трасцянец" не існуе, то асноўныя цяжкасці звязаны з пераносам паэтычнага зместу ў план асабістых асацыяцый. Не ўзнікне асацыяцый – не адбудзецца і ўспрыманне.

Настаўнік зыходзіць з таго, што паэтычная мова аўтара непарыўна звязана з працай яго свядомасці, таму такія ж творчыя нама-

Рэпазіторый БарДУ

ганні неабходныя і чытачу, каб ён мог зразумець твор. Гэтым абумоўлена сістэма работы над вершам "Трасцянец".

Матэрыял рызыкуе страціць сэнс з-за адсутнасці неабходных ведаў, таму настаўнік ва ўступным слове звяртаецца да трагічнай старонкі нашай гісторыі, Вялікай Айчыннай вайны, да жахлівага прызначэння лагера ў Трасцянцы.

Маналог настаўніка стварае адпаведны эмацыянальны настрой, "устаноўку на чытанне", якая стымулюецца дэманстрацыяй карціны М. Савіцкага ("Мадонна Біркенаў" з цыкла "Лічбы на сэрцы") на фоне гучання "Рэквіема" Моцарта. Такое комплекснае ўздзеянне на розныя пачуццёвыя аналізатары ўзмацняе эстэтычнае ўспрыманне і здольна выклікаць больш глыбокія пачуцці. Наступнае чытанне верша настаўнікам уяўляе сабой усхваляваны маналог, які нібыта нарадзіўся толькі што і таму валодае вялікай сілай канкрэтнай скіраванасці да чытача.

Мастацтва патрабуе не толькі сузірання, а і працы. Вастрыня эстэтычных рэакцый залежыць ад ступені развіцця аналітыка-сінтэтычнай дзейнасці, аднак пераход да аналізу здольны разбурыць настраёвасць урока, таму ён павінен пачынацца як мага больш непрыкметна, у прыхаваных формах.

Вучням прапануецца невялікая пісьмовая работа, складанне "партытуры пачуццяў", якая дазваляе ім пэўны час пабыць сам-насам з вершам, а затым абгрунтаваць чытанне яго настаўнікам ці прапанаваць свой узор. Клас працуе з нескарочаным варыянтам верша і выдзяляе ў ім тры сэнсавыя часткі. Пры пераходзе да кожнай наступнай мяняецца танальнасць верша. Вучні адзначаюць, што па форме ўвесь верш – зварот, заклік да жывых, але найбольш гэта выяўляецца ў першай сэнсавай частцы, дзе аўтар карыстаецца сродкамі, блізкімі да публіцыстычных, скупымі дакументальнымі звесткамі. Аднак яны спалучаюцца з метафарамі ("тут навекі чарнеў небакрай", "попел сэрцаў нашых ракоча ў зямлі") і ўтвараюць эмацыянальны малюнак глыбокага хвалявання, якое стрымліваецца вялікімі намаганнямі.

Другая сэнсавая частка – гэта ўспамін пра мірнае ўчора, якое здаецца нават нерэальным цяпер, на пагібельным краі. "Навошта вярэдзіць душу ўспамінамі" – так аргументуюць вучні кампазіцыю гэтай часткі. У ёй па гэтай жа прычыне, упэўнены многія, больш выразныя знакі прыпынку, бо думкі вучняў блытаюцца, абрываюцца. Пяшчота і замілаванасць успамінаў змяняюцца болем, горычу ад немагчымасці адстаяць сваю свабоду і жыццё. Адсюль у апошняй сэнсавай частцы чуецца не толькі ўнутранае напружанне, непакой, трывога з-за таго,



Рэпазіторый БарДУ

што яшчэ "лётае ноч над зямлёй", а і надзея на нашчадкаў, якія не дазволяць, "каб цемра ўпала на край". З улікам такіх высноў і чытаўся верш на працягу ўрока.

Паказальна, што ў эмацыянальнай гаме ні разу не прагучала слова "адчай", і гэта абумовіла такое пытанне настаўніка: якое паняцце бліжэй да азначэння ідэі твора – эпітафія, рэквіем ці жалобны марш? (значэнне кожнага з гэтых слоў папярэдне растлумачана). Адразу адкідаецца паняцце "жалобны марш". У якасці эпітафіі дапускаецца першая сэнсавая частка. У рэквіеме ж адчуваюцца "ноткі надзеі" на неўміручасць жыцця, што адзначаюць вучні і ў вершы. Гэтае ўражанне, на іх думку, ствараюць такія мастацкія сродкі, як параўнанні і метафары: "сэрцы грымяць, як мячы" (абуджаюць памяць), "мы згарэлі паходнямі ў лютай начы" (але высвецілі не толькі жахі і нелюдства, а і шматлікія высакародныя ўчынкі. Нездарма многія беларусы атрымалі ганаровыя званні "Праведнікаў свету" за выратаванне яўрэяў ў гады вайны).

Асаблівая роля адводзіцца ў гэтым вершы паўторам, іх гучанню. У першым выпадку ў вучняў узнікаюць асацыяцыі з рэхам, якое спачатку слабое, а затым узмацняецца, бо падхопліваецца ўсё большай колькасцю ахвяр і вяртаецца да чытача заклікам "Памятай!!!" У другім выпадку адны асацыіруюць гучанне гэтага слова са стукам колаў цягніка, які вязе ахвяры на пагібель, усё бліжэй і бліжэй да страшнага месца ("Па-мя-тай!!!"). Некаторыя згадваюць стук метранома, а праз яго – хвіліну маўчання ў Дзень перамогі.

Наяўнасць асацыятыўных вобразаў у школьнікаў сведчыць пра эстэтычнае ўспрыманне дадзенага верша. Яго паўнацэннасць залежыць ад выдзялення змястоўнасці, эмацыянальнасці і выразнасці мастацкага твора, што забяспечваецца адпаведнай методыкай вывучэння.

У фінале ўрока вучні сінтэзуюць атрыманую інфармацыю на аснове плана-алгарытму аналізу лірычнага твора:

1. Назва, аўтар, час напісання.
2. Тэма і ідэя твора. Від лірыкі.
3. Асаблівасці кампазіцыі.
4. Мастацкія сродкі і іх роля ў выражэнні ідэі.
5. Танальнасць і настрой верша. Дынамічныя яны ці статычныя?
6. Асабістыя думкі, пачуцці, перажыванні, што ўзніклі пры чытанні верша.
7. Якое месца займае дадзены верш у творчасці паэта?

Такім чынам, вывучэнне лірычных і ліра-эпічных твораў Ул. Караткевіча спрыяе асэнсаванню далёкай і блізкай гісторыі



Рэпазіторый БарДУ

Айчыны, садзейнічае фарміраванню ацэначных адносін да яе, а ў выніку – каштоўнасных арыентацый, у якіх агульначалавечае праламляецца праз нацыянальную і канкрэтна-асобасную адметнасць, што выявілася ў працэсе суаднясення, супастаўлення, параўнання, асацыятыўнага ўспрымання свету праз прызму вывучаемых твораў. Эмацыянальна-каштоўнасныя адносіны да гістарычных фактаў, падзей, з'яў і працэсу іх пазнання ёсць сутнасць гісторыка-патрыятычнай свядомасці ў яе аксіялагічным аспекце.

Літаратура


1. Вашко Л. Гістарызацыя свядомасці: Бел. літ. і беларушчына на пачатку XX ст.: Навук. публіцыстыка. Масты; Гародня; Менск, 1997. – 150 с.
2. Гулыга А.В. Эстетика истории.– М.: Наука, 1974.– 127 с.
3. Рожина Л.Н., Лобанов А.П. Развитие творческого мышления и творческих способностей учащихся на уроках литературы // А і В.– 1997.– № 11.– С. 65 – 70.
4. Уайтхед А. Избранные работы по философии: Пер. с англ.– М.: Прогресс, 1990.– 716 с.


Репозиторий БарГУ